УДК 375 (075.8)

***Вяч. М. Смаль***

# МАЛЫЯ ФОРМЫ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ ЯК ФАКТАРРАЗВІЦЦЯ МАЎЛЕННЯ І ВЫХАВАННЯ ДЗЯЦЕЙ СТАРЭЙШАГАДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

У артыкуле разглядаецца значэнне фальклора ў развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, эфектыўныя метады і прыёмы іх лінгвістычнага навучання, распаўсюджаныя педагагічныя праблемы і шляхі іх вырашэння педагогамі ўстаноў дашкольнай адукацыі.

Прыярытэтнай фундаментальнай асновай айчыннай сістэмы адукацыі з'яўляецца выхаванне нацыянальна свядомай асобы дзіцяці, сапраўднага патрыёта ў сучасным грамадстве, які здольны забяспечыць духоўную пераемнасць паміж сучаснікамі, продкамі і нашчадкамі. Родная культура пры гэтым павінна выступаць гарантам адчування вечнасці, роўнавагі і бяспекі, неабходных чалавеку для нармальнага біяпсіхічнага развіцця і жыццядзейнасці. Дашкольная адукацыя і выхаванне як пачатковы культураўтвараючы фактар дапамагаюць індывіду і нацыі інтэгравацца ў адзінае цэлае, паглыбляць іх самасвядомасць. Таму глыбока нацыянальнай павінны быць як сама сістэма дашкольнай адукацыі, так і маўленчае развіццё дзяцей дашкольнага ўзросту, у якім неабходна знаходзіць месца нацыянальнаму фальклору. Нездарма дашкольнікі слушна былі названы ў «Канцэпцыі адукацыі і выхавання ў Беларусі» (1993 г.) «прадаўжальнікамі родных этнакультурных традыцый на аснове высокай нацыянальнай самасвядомасці», што з'яўляецца актуальным і ў праэкцыі сённяшняга дня [4, с. 8].

Беларускі фальклор з'яўляецца рэгулятарам сацыяльных паводзін у дзіцячым калектыве, часткай усёй народнай педагогікі, мае вялікае пазнавальнае і выхаваўчае значэнне. У гэтым сэнсе асобныя навукоўцы (М.Б. Яфімава, І.Д. Воюш і інш.) слушна адзначаюць што «ў фальклорных творах фіксуецца выхаваўчы вопыт народа; педагагічны талент бліскуча выявіўся ў шматлікіх калыханках, пацешках, пястушках, загадках, вершах, песнях, казках» [2, с. 26]. Як падкрэсліваюць Г. Шынкар і І. Новікава, «каштоўнасць фальклора заключаецца ў тым, што з яго дапамогай дарослы лёгка наладжвае кантакт», «пабуджае дзяцей да пазнавальнай актыўнасці» [9, с.10]. Так, загадкі выклікаюць патрэбу ў дзіцяці ўступіць у эмацыйны кантакт з дарослым, калыханкі супакойваюць, пацешкі забаўляюць, ствараюць добразычлівы эмацыйны настрой, байкі выклікаюць пазнавальную цікавасць і даюць узор нормаў чалавечых паводзін. Гучнасць, рытмічнасць, напеўнасць, займальнасць малых форм фальклору цікавяць дзяцей, выклікаюць у іх жаданне паўтарыць, запомніць, а значыць спрыяюць развіццю звязнага маўлення.

Сёння, у час актыўнага і празмернага запазычвання іншаземнай лексікі грамадствам, надзвычай важна стварыць паўнавартасныя ўмовы для развіцця звязнага маўлення дашкольнікаў з дапамогай малых форм фальклору, які ўяўляе сабой, з аднаго боку, *крыніцу лексічнай чысціні*, з другога – каштоўную *сістэму* традыцыйных правіл, прынцыпаў *сямейнага выхавання.* Псіхолагі і метадысты адзначаюць, што дзіцяці засвойвае мову найперш у працэсе імітавання маўлення асяроддзя (Д.Б. Эльконін, Р.Е. Левіна, А.П. Усава, Л.І. Ціхеева і інш.). Нажаль, бацькі ў наш час з-за складаных сацыяльных умоў, недахопу часу не надаюць гэтаму належнай увагі, і працэс развіцця маўлення дзіцяці становіцца стыхійным, калі на яго ўплывае тэлебачанне, камп'ютар, а не лінгва-камунікатыўнае асяроддзе. У выніку творы багатага нацыянальнага фальклора (калыханкі, забаўлянкі, прымаўкі, песні і інш.) практычна не выкарыстоўваюцца ў актыўным ужытку дзяцей дашкольнага ўзросту.

На практыцы даводзіцца сутыкацца з тым, што педагогі пры знаёмстве старэйшых дашкольнікаў з малымі фальклорнымі формамі звяртаюць увагу пераважна на змест, пакідаючы па-за ўвагай *жанравыя і моўныя асаблівасці* твораў. Найчасцей педагогі «палягчаюць» сабе працу, зводзяць яе да прымітыўнага завучвання прымавак, пацешак, загадак. Педагогі-дашкольнікі са своеасаблівым недаверам ставяцца да фальклорных твораў, памылкова лічаць іх не сучаснымі, састарэлымі, не абавязковымі і малаэфектыўнымі ў развіцці маўлення дашкольнікаў, асабліва старэйшага ўзросту, калі дзеці асабліва актыўна засвойваюць звязнае маўленне. Па-сутнасці, існуе неадпаведнасць патэнцыйных магчымасцяўмалых форм фальклора ў развіцці звязнага маўлення старэйшых дашкольнікаў і рэальнага педагагічнага працэсу. Таму існуе патрэба, па-першае, *папулярызацыі* малых форм фальклора ў працэсе маўленчай дзейнасці дашкольнікаў, а па-другое – распрацоўкі зразумелай, паслядоўнай, *эфектыўнай праграмы* па развіцці звязнага маўлення дашкольнікаў. Рэалізацыя дадзенай праграмы павінна ажыццяўляцца як на спецыяльна арганізаваных занятках, так і ў паўсядзённай дзейнасці дашкольнікаў, прычым неабходным кампанентам павінна стацца персанальная зацікаўленасць выхаваццеля.

Вучоныя (Ю.Р. Іларыёнава, К.І. Ціхеева, Ф.А. Сахін, А.М. Бародзіч, С.С. Бухвостава, А.С. Ушакова, А.П. Усава, А.Я. Мацкевіч і інш.) адзначаюць, што ўзровень развіцця маўлення старэйшых дашкольнікаў мае індывідуальныя характарыстыкі, але ў цэлым дазваляе эфектыўна выкарыстоўваць малыя жанры фальклора ў навучальным працэсе. Асаблівасцю дыялагічнага маўлення дзяцей з’яўляецца здольнасць актыўна ўдзельнічаць у гутарцы, поўна і дакладна адказваць на пытанні, дапаўняць і выпраўляць памылкі ў адказах іншых, даваць даместу рэплікі, фармуляваць пытанні. Характар дыялога дзяцей залежыць ад складанасці задач, якія вырашаюцца ў сумеснай дзейнасці. Дзеці гэтага ўзросту здольны самастойна пабудаваць звязнае маналагічнае выказванне (апавяданне з уласнага вопыту, па серыі карцін, апісанне групы лялек). Дзеці здольны рэгуляваць інтанацыйнае афармленне маўлення (гучнасць, тэмп, інтанацыі) у залежнасці ад сітуацыі. У працы з дзецьмі неабходна ўлічваць і аб’ектыўныя недахопы маўлення дзяцей: цяжкасці ў падборы фактаў для апавядання, парушэнне лагічнай паслядоўнасці выказвання, складанасць у перадачы ўласных эмацыйных адносінаў да прадметаў і з’яў і інш.

Дзеці старэйшага дашкольнага ўзросту здольны адрозніваць фальклорныя творы розных жанраў, з якімі яны знаёміліся раней; яны выказваюць свае адносіны да слоў і выразаў, зместу народных твораў, імкнуцца запомніць і ўзнавіць тое, што спадабалася. Асаблівасцю гэтага ўзросту дзяцей з’яўляецца *дыферэнцыяцыя* дзейнасці: адны дзеці аддаюць перавагу праслухоўванню вершаў, іншыя – загадкам, другія – інсцэніроўкам. Многія дзеці толькі ў старэйшым дашкольным узросце здольны зразумець гумарыстычныя творы, эмацыйна адгукаюцца на камічнае. Усё гэта неабходна выкарыстоўваць педагогу ў развіцці пазнавальных уменняў, у маўленчай працы з дзецьмі.

Малыя формы беларускага фальклора эфектыўна ўключаць у развіццё маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту пры навучанні пераказу і творчаму апавяданню (сачыненню), у інсцэніроўкі мастацкіх твораў, у тэатральна-гульнявую дзейнасць. Выкарыстанне вершаў, лічылак, прымавак, пацешак і іншых жанраў узбагачае такія кампаненты мастацка-маўленчай дзейнасці, як выразнае *чытанне, пераказ, творчае апавяданне.* Шэраг малых форм беларускага фальклора пабудаваны на аснове дыялогаў, таму яны садзейнічаюць далейшаму развіццю і ўдасканаленню звязнага *дыялагічнага* маўлення дашкольнікаў.

Айчынныя даследчыкі (Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна) слушна адзначаюць, што «мастацкія творы выконваюць у старэйшым узросце і *дыягностыка-карэктыўнуюфункцыю.* Яны дапамагаюць дзіцяці пазбавіцца негатыўных эмоцый,

наладзіць станоў-чыя ўзаемаадносіны з навакольным светам» [8, с. 223]. У гэтым сэнсе дыягностыка-ка-рэктыўная функцыя малых жанраў фальклору можа быць найбольш эфектыўна рэалі-завана ў старэйшым дашкольным ўзросце па той прычыне, што менавіта ў гэты час дзі-ця пераходзіць на новы этап пазасітуацыйна-асабовых зносін, калі ў яго ўзрастае ціка-васць да праблем узаемастасункаў паміж людзьмі. Паводле даследаванняў М.І. Лісінай, А.Р. Рузскай, Л.М. Галігузавай, старэйшых дашкольнікаў «пачынаюць хваляваць такія маральныя катэгорыі, як сумленнасць, справядлівасць, павага, сяброўства», – усё тое, што, па сутнасці, складае ідэйны змест народных твораў [3, с. 18].

Уплыў малых форм беларускага фальклора на развіццё маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту неабходна разглядаць у кантэксце агульных задач па развіцці мастацка-маўленчай дзейнасці. Малыя формы беларускага фальклора выконваюць наступныя функцыі:

1) развіваюць мастацкі густ дзіцяці;

2) садзейнічаюць узнікненню эмпатыі ў адносінах да герояў твора;

3) пашыраюць літаратурны вопыт дашкольнікаў, якія даведваюцца пра новыя жанры;

4) спрыяюць развіццю чуцця мовы, фарміруюць уменне карыстацца вобразна-выяўленчымі сродкамі фальклора, вобразнымі словамі і выразамі ў гутарковым маўленні;

5) стымулююць самастойны пошук выразных сродкаў для стварэння вобраза, захвочваюць да імправізацыі маналогаў, дыялогаў у гульні-драматызацыі.

*Прымаўкі* карысны тым, што маюць спецыфічную інтанацыю, многія з іх пабудаваны на лексічных сродках выразнасці (параўнаннях, эпітэтах), яны змяшчаюць адносіны народу да нейкай з'явы ці прадмета. В.П. Адрыянава-Ператц адзначае, што прымаўкі ў абагуленым выказванні пра тыповыя з'явы змяшчаюць у сабе найбольш устойлівую частку лексікі мовы, у іх адсутнічае празмернае прыхарошванне, думкі перадаюцца толькі самымі неабходнымі і толькі дакладна адабранымі словамі [7, с. 174]. Акрамя таго, як трапна адначае Н.А. Дзмітрыева, у прымаўках тое, што адлюстравана словам у большай ці меншай ступені зразумела: эмоцыі, настрой, перажыванні [6, с. 17]. Выкарыстоўваючы ў сваім маўленні прымаўкі, дзеці вучацца ясна, лаканічна, выразна фармуляваць свае думкі і пачуцці, інтанацыйна афармляць сваю гаворку, развіваюць уменне творча карыстацца словам, вобразна і яскрава апісваць з'явы і прадметы. Па назіранні К.Д. Ушынскага, прымаўкі дапамагаюць «выламаць маўленне дзіцяці» [5, с. 26].

У дашкольнікаў нават старэйшага ўзросту нярэдка сустракаюцца праблемы з успрыманнем і разуменнем малых форм фальклора. Вядома, што дашкольнікам цяжка зразумець і інтэрпрэтаваць сэнс прымавак, бо для гэтага неабходны пэўны інтэлектуальны ўзровень, веданне асноўных маральна-этычных правілаў. Асобныя дзеці могуць толькі пераказаць асноўны сюжэт, назваць герояў, г.зн. узнавіць наглядны адзінкавы вобраз, які адпавядае канкрэтнай сітуацыі. Падтэкст, які складае найчасцей ідэйна-зместавую аснову прымаўкі застаецца для дашкольнікаў недасягальным. Менавіта таму для паўнавартаснага разумення і ўспрымання такой фальклорнай формы, як прымаўка неабходна мэтанакіраваная работа ў гэтай галіне з дзецьмі і малодшага і сярэдняга ўзростаў, каб пасля, у старэйшым узросце, не сутыкацца з верагоднымі цяжкасцямі. Е.А. Флерына, А.П. Усава, Р.Н. Кліменка, Н.І. Арлова, Н.М. Гаўрыш, каб пазбегнуць зазначаных праблем у разуменні сэнсу прымавак і іх ужыванні, прапаноўвалі *«падсвечваць»* імі працоўную дзейнасць, калі дзеці будуць вучыцца натуральна, нязмушана ўжываць гэтыя творы ў патрэбнай сітуцыі.

Даследчыкі праблем разумення малых форм фальклора дзецьмі дашкольнага ўзросту (Н.М. Гаўрыш, Р.Н. Кліменка, Э.А. Федэравічэне і інш.) слушна адзначалі, што

ў дзяцей у працэсе аўдыравання ўзнікаюць асацыяцыі, прычым не на змест усёй прымаўкі, а на нейкае асобнае слова з яе і гэта перашкаджае дзіцяці адарвацца ад канкрэтнай сітуацыі, перайсці да абагуленага вобразу. Напрыклад, у прымаўцы «Людзей слухай, а свой розум май»:«Гэта пра нейкіх людзей, што многа размаўлялі і згубілі розум»;«Ад крадзенага не пасыцееш» – «Гэта пра злодзея» і г.д. Тым не менш пры сістэматычнай працы дзяцей з прымаўкамі старэйшыя дашкольнікі ўжо здольны не толькі разумець фальклорныя выразы, але і рабіць на іх аснове ўласныя лагічныя вывады.

*Загадкі* спрыяюць фарміраванню вобразнасці маўлення дашкольнікаў, бо ўключаюць у сябе шматлікія сродкі выразнасці (прыём персаніфікацыі, выкарыстанне шматзначнасці слова, азначэнняў, эпітэтаў, параўнанняў, асаблівай рытмічнай арганізацыі). Загадкі ўзбагачаюць слоўнік за кошт шматзначнасці слоў, фарміруюць разуменне пераноснага значэння слова. Загадкі карысны і ў працэсе засваення гукавога і граматычнага ладу маўлення, прымушаюць дзіцяці звярнуць увагу на моўную форму і рабіць прымітыўны яе аналіз. Паводле Н.А. Апалонавай, загадкі развіваюць здольнасць аналізаваць, абагульняць, фарміруюць уменне выразна выдзяляць характэрныя прыметы прадметаў і з'яў, уменне ярка і лаканічна перадаваць вобразы прадметаў, развіваюць у дзяцей «паэтычны погляд на рэчаіснасць» [1, с. 79].

Арыгінальная методыка працы дзяцей з загадкамі распрацавана Ю.Р. Іларыёнавай. Даследчыца лічыла, што загадкі фарміруюць асаблівае чуццё мовы ў дзяцей, якія вучацца выкарыстоўваць розныя маўленчыя сродкі, адбіраць трапныя і дакладныя словы, пастулова авалодваць вобразнай сістэмай роднай мовы. Пры гэтым звязнае маўленне апісальнага характару яна лічыла мэтазгодным развіваць у спалучэнні загадак з выкарыстаннем літаратурных твораў, ілюстрацый, карцін.

Эксперыментальныя даследаванні Н.М. Гаўрыш паказваюць, што дашкольнікам значна цяжэй адгадваць загадкі метафарычнага зместу, чым апісальныя. Яна звярнула ўвагу на тое, што некаторыя дзеці не разумеюць вобразнага ладу мовы загадак і не адэкватна інтэрпрэтуюць метафары. У большасці выпадкаў у дзяцей узнікаюць асацыяцыі на нейкае асобнае слова ці спалучэнне слоў. Напрыклад, у загадцы пра воблака на слова «белы»:«Гэта белыя мядзведзі», «Лебедзь, бо ён белы»; у загадцы пра лісу асацыяцыі на словы «няма дыму і пажару» – «Гэта пажарная машына», «Пажарнікі, бо яны пажар тушаць, і няма дыму і пажару» [3, с. 19].

Цікава, што ў апавяданні, казцы, вершы дзеці значна лягчэй успрымаюць метафару, чымсці ў загадцы. Гэта тлумачыцца тым, што ў мастацкім тэксце апісваецца рэальная сітуацыя, а загадка – гэта выказванне не прамое, завуаліраванае, прыхаванае. Таму асваенне вобразнага ладу мовы, усведамленне пераноснага сэнсу слоў і словазлучэнняў магчыма толькі на пэўным узроўні развіцця абстрактнага і вобразнага мыслення. Педагогу неабходна планаваць працу па развіцці звязнага маўлення дашкольнікаў такім чынам, каб ужо ў малодшым узросце ў дзяцей закладваліся ўменні працы з вершамі і невялікімі па памеры празаічнымі творамі.

Псіхолагі, педагогі, лінгвісты (А.А. Пацябня, Л.С. Выгоцкі, А.У. Запарожац, В.К. Харчанка, К.Е. Хаменка, Н.М. Юр'ева, В.І. Малініна, Э.А. Федэравічэне, А.М. Самкова і інш.) тлумачылі цяжкасці, што ўзнікаюць у працэсе разумення дзецьмі пераноснага сэнсу слоў і словазлучэнняў, наяўнасцю ў маўленчым вопыце дзяцей у адрозненні ад дарослых пераважнай большасці слоў з адзіным прамым намінатыўным значэннем, якое адлюстроўвае асноўны значны прадметна-лагічны змест. Існуе і іншая праблема: дзеці разумеюць лексічныя сродкі выразнасці ў пачутым тэксце, аднак не ўжываюць іх на практыцы. На гэтую акалічнасць звяртаў увагу і калектыў навукоўцаў пад кіраўніцтвам Ф.А. Сахіна (В.І. Логінава, А.І. Максакаў, Е.М. Струніна, А.Р. Тамбоўцава, А.С.Ушакова, М.Ф. Фамічова) і раіў сінонімы, антонімы, шматзначныя словы і інш. пераносіць у сістэматычныя творчыя практыкаванні: «Не заўсёды дзеці выкарыстоўваюць атрыма-

ныя веды і ўменні ва ўласнай дзейнасці. Яны заўважаюць вобразныя словы, параўнанні, эпітэты ў літаратурным творы, аднак самі прымяніць іх не могуць. Выкананне творчых заданняў, г.зн. сістэматычныя практыкаванні, дапамагаюць ім выкарыстоўваць гэтыя веды ў сваім маўленні і ў самастойнай дзейнасці – творчым апавяданні» [5, с. 161].

Практыка паказвае, што пры адгадванні загадак дзеці старэйшага ўзросту няўважліва слухаюць тэкст загадак, не запамінаюць поўнасцю іх змест, пры адгадванні і параўнанні не выкарыстоўваюць усе прыметы з тэксту. Прычына гэтага ў тым, што дзеці не маюць дастаткова ведаў пра загаданае, а таму не здольны правільна прааналізаваць, параўнаць, абагуліць прыметы, што падаюцца ў фальклорных творах. Прычым нават калі дзіцяці дае дакладны адказ, неабходна адрозніваць адгадванне мэтанакіраванае і выпадковае. Мэтанакіраваныя адказы дашкольнікаў з'яўляюцца ў працэсе зацікаўленых, самастойных пошукаў, праверак дакладнасці магчымых адгадак, імкнення патлумачыць свой адказ, аргументавана даказаць яго правільнасць. Пры мэтанакіраванай працы пераважная большасць старэйшых дашкольнікаў здольна адгадваць загадкі як з дакладна названымі прыметамі, так і з зашыфраванымі ў падтэксце.

*Калыханкі* карысны для дзяцей старэйшага ўзросту тым, што даюць дзіцяці ўзоры шматлікіх граматычных форм і сінтаксічных канструкцый. Калыханкі можна выкарыстоўваць для навучання дашкольнікаў утварэнню аднакарэнных слоў (кот – коцік – каток – коця – каточак і г.д.). Калыханкі – эфектыўны сродак фарміравання фанематычнага ўспрымання, чаму садзейнічае іх асаблівая інтанацыйная арганізацыя (працяглае выдзяленне галосных гукаў, павольны тэмп, просты рытміка-інтанацыйны малюнак і інш.), паўторы фанем, гукаспалучэнняў і гукаімітацый. Калыханкі садзейнічаюць хуткаму запамінанню слоў і іх форм, словазлучэнняў, знаёмяць з новай лексікай, што абумоўлена іх станоўчым эмацыйным падтэкстам. Калыханкі карысны для старэйшых дашкольнікаў магчымасцю іх выкарыстання ў працы над інтанацыйнай выразнасцю маўлення, бо гэтыя творы як раз і будуюцца на гукаспалучэннях-наігрышах, якія паўтараюцца некалькі разоў з рознай інтанацый, а напеўнасць і асаблівы рытм калыханак вучыць дзяцей плаўнаму вымаўленню фраз і сказаў.

Фальклорныя *песні, пацешкі, пястушкі* эфектыўна выкарыстоўваць для фарміравання граматычнага ладу маўлення, у навучанні дзяцей утварэнню аднакарэнных слоў, у развіцці фанематычнага слуха, бо ў іх змяшчаюцца гукаспалучэнні-наігрышы, якія паўтараюцца ў розным тэмпе і з рознай інтанацыяй. Канцэнтрацыя ў песнях і пацешках эпітэтаў, параўнанняў, сінонімаў, антонімаў спрыяе лаканічнасці, выразнасці і вобразнасці звязнага выказвання дзяцей. Пацешкі, хуткагаворкі, прымаўкі мэтазгодна выкарыстоўваць пры фарміраванні дакладнасці і звонкасці гукавымаўлення, дыкцыі, якая адпаведна ўплывае і на звязнае маўленне дашкольніка. Малыя формы фальклору лаканічныя і дакладныя па форме, глыбокія і не складаныя па зместу, рытмічныя і запамінальныя. Яны садзейнічаюць развіццю рухомасці і гібкасці артыкуляцыйнага апарата, дыкцыйнай працы, фарміруюць правільнае гукавымаўленне, дапамагаюць засваенню дзіцяці інтанацыйнага багацця мовы, рознага тэмпу вымаўлення.

Удала падабраная, з выразнасцю агучаная пацешка можа дапамагчы ўстанавіць кантакт з дзіцём, вызваць у яго станоўчыя эмоцыі, сімпатыю да яшчэ малазнаёмага выхавацеля. У тэкст пацешкі можна ўставіць любое імя, не змяняючы зместу, што выклікае ў дашкольнікаў радасны настрой, жаданне паўтарыць тэкст. У кантэксце старэйшага дашкольнага ўзросту пацешкі можна выкарыстоўваць пры падрыхтоўцы да сна, падчас апранання на прагулку, умывання, у працэсе гульнявой дзейнасці. З часам дзеці прывучаюцца самастойна выкарыстоўваць пацешкі ў сваіх гульнях, суправаджаючы імі працэс кармлення лялькі ці ўкладванне яе спаць.

Песні і лічылкі асабліва эфектыўна выкарыстоўваць на музычных і фізкультурных занятках. Лічылкі не проста актывізуюць маўленчыя дзеянні дашкольнікаў, яны да-

зваляюць зрабіць гэта нязмушана, натуральна. Па-сутнасці, дзецям можна толькі даць узор цікавага твора, а яны з задавальненнем запамінаюць лічылку, якая ім падабалася самастойна, у працэсе гульнявой дзейнасці з аднагодкамі. Дзіцячыя народныя песні развіваюць не толькі музычны слых і памяць, але і лёхкія, дыханне, галасавы апарат, бо большасць заклічак, дражнілак, спяваюцца поўным голасам, як можна гучней, з суправаджэннем рухаў рукамі. Сукупнасць рухаў цела, дробнай маторыкі рук і органаў маўлення спрыяюць зняццю напругі, вучаць карыстацца маўленчымі паўзамі, дапамагаюць пазбавіцца манатоннасці вымаўлення, нармалізуюць тэмп і фарміруюць правільнае вымаўленне. Завучванне тэкстаў песен паралельна з рухамі спрыяе развіццю памяці і ўяўленню дзяцей, актывізуе працэсы думання, што ў сукупнасці непасрэдным чынам добратворна ўплывае на развіццё звязнага маўлення. Думаецца, карыснымі прыёмамі могуць стаць у педагагічным арсенале выхавацеля музычныя гульні-загадкі, гульні-фантазіі з эмацыйнымі паштоўкамі, прыдумванне дадатковых прадметных вобразаў у фальклорным творы сугучных рознаму эмацыйнаму зместу музыкі.

*Забаўлянкі, байкі, песні* таксама вядомы і любімы дзецьмі, аднак вытлумачэнне іх зместу найчасцей зводзіцца дзецьмі да пераліку персанажаў. Прычыны гэтага ў несістэматычнай працы педагогаў па выкарыстанні малых форм фольклора ў развіцці маўлення дзяцей.Айчынныя даследчыкі Н.С. Старжынская і Д.М. Дубініна падкрэсліваюць, што дзеці старэйшага ўзросту здольныя перажываць у сваіх уяўленнях змест фальклорных твораў: «У гэтым узросце яны пераходзяць на стадыю ўласна мастацкіх адносін да літаратуры. Тут успрыманне мастацкага твора суправаджаецца спачуваннем, здольнасцю перажыць змест твора ў сваіх дзеяннях, патрэбай утакога рода перажываннях»[8, с. 226]. Асэнсаванне зместу фальклорных твораў у дзяцей любога ўзросту наіўна-рэалістычнае, аднак калі малодшыя дашкольнікі свае адносіны праяўляюць знешне ярка, не стрымана, то з 4–5 гадоў у іх назіраецца значна большая асэнсаванасць, глыбіня і ўстойлівасць меркаванняў. Гэтая акалічнасць сведчыць пра неабходнасць уключэння ў змест працы па развіццю маўлення старэйшых дашкольнікаў твораў з сур’ёзным маральна-этычным зместам, у якіх будзе выразна выяўлены канфлікт герояў, падзел на станоўчых і адмоўных персанажаў, матывіроўка паводзін герояў, логіка падзей. Менавіта ў гэтым узросце неабходна асаблівую ўвагу надаваць тым формам фальклора, якія стануць трывалай базай у будучым дарослым маўленні, увойдуць у актыўны ўжытак і ў пазнейшы ўзроставы перыяд. А гэта ўжо і народныя песні, і фразеалагізмы, і прымаўкі, а не толькі забаўлянкі, загадкі, хуткагаворкі. Неабходнасць працяглага і трывалага азнаямлення дзяцей з фальклорнымі творамі азначаў і А.У. Запарожац: «Дзіця праходзіць доўгі шлях развіцця адносін да мастацкага твора: ад непасрэднага наіўнага ўдзелу ў адлюстроўваемых падзеях да больш складаных формаў эстэтычнага ўспрымання, якія для правільнай ацэнкі з’яў патрабуюць умення заняць пазіцыю па-за імі, паглядваючы на іх быццам бы збоку» [8, с. 227].

Шэраг даследчыкаў (В.І. Глоцер, К.І. Чукоўскі і інш.) рэкамендавалі аддаваць перавагу ў развіцці маўлення старэйшых дашкольнікаў сярод розных фальклорных жанраў менавіта вершаваным (песні, вершы, пацешкі, пястушкі). У прыватнасці, Н.С. Старжынская і Д.М. Дубініна падкрэсліваюць, што «дашкольны ўзрост лічыцца найбольш спрыяльным перыядам мастацкага ўспрымання паэзіі. У гады дзяцінства назіраецца асаблівае імкненне дзіцяці да рытмічна арганізаванага складу маўлення. Дашкольнікі вельмі любяць вершы. Яны аадаюць ім відавочную перавагу ў параўнанні з празаічнымі творамі. Дзяцей цягне да дынамічных рытмаў, радаснай мелодыкі, рыфмы. Яны без перапынку патрабуюць паўтараць кароткія, добра рытмізаваныя вершы з дакладнай, зразумелай і яркай рыфмай» [8, с. 229]. Дашкольнікі дакладна вызначаюць настраёвасць верша, нават калі не разумеюць значэння асобных слоў ці адлюстроўваемых пэўных сітуацый. Калі даросламу неабходна зразумець змест, то маленькія слухачы атрымліва-

юць задавальненне непасрэдна ад гучання верша. Разам з тым, такія фальклорныя жанры, як прымаўкі, прыказкі, байкі, не могуць быць паўнавартасна засвоены дзецьмі самастойна, звычайным перайманнем з маўлення дарослых. Дашкольнікам нават старэйшага ўзросту неабходна тлумачыць іх падтэкст, аўтарскую думку, алегарычны змест.

Метады развіцця маўлення з выкарыстаннем малых форм фальклора вучоныя (Ф.А. Сахін, А.М. Бародзіч, С.С. Бухвостава, А.С. Ушакова, М.М. Аляксеева, В.І. Яшына) ўключалі ў агульную методыку працы з літаратурнымі творамі і кнігай, што не зусім апраўдана, бо многія малыя формы (пацешкі, лічылкі) ў адрозненні ад вялікіх (казка, апавяданне) не могуць быць у рамках традыцыйных метадаў цэнтральным і асноўным кампанентам, матэрыялам заняткаў па развіцці маўлення. Яны могуць толькі «падсвяціць», «упрыгожыць», «выхаваць», быць часткай агульнай працы, звяном сітэмы маўленчай дзейнасці. Самыя распаўсюджаныя метады развіцця маўлення дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту з выкарыстаннем малых форм фальклору наступныя:

1. *Чытанне выхавальніка*, г.зн. даслоўная перадача тэкста. Спецыфіка фальклорнага тэксту ў тым, што ён ствараўся для вуснага ўспрымання і вымаўлення, таму пажадана, каб выхавальнік чытаў творы напамяць. У такім выпадку маўленне будзе больш выразным, лаканічным, інтанацыйна багатым. Дзеці атрымаюць узор, які, магчыма, стане штуршком да іх асабістага жадання выказацца. Найчасцей чытанне суправаджаецца паказам карцін, рэпрадукцый, фотаздымкаў і інш.

2. *Завучванне напамяць;* гэты метад можна выкарыстоўваць у працы з рознымі жанрамі фальклору (лічылкі, хуткагаворкі, песні, байкі і інш.).

3. *Інсцэніраванне,* метад драматызацыі, узнаўлення тэксту. Найчасцей яго прымяненне зводзіцца да тэатралізаваных гульняў, поўнасцю пабудаваных на фальклорным матэрыяле, або з уключэннем фальклорных твораў як аднаго з сюжэтна-кампазіцыйных элементаў у працы са старэйшымі дашкольнікамі.

4. *Маляванне* эпізодаў, адлюстраваных у фальклорным творы.

5. *Падбор* літаратурнага твора (твора жывапісу), адпаведнага фальклорнаму тэксту.

6. *Параўнанне* фальклорных твораў з супрацьлеглым зместам.

7. *Разгляд кнігі і малюнкаў* з яе.

8. *Славесныя гульні* («Адгадай, хто я», «Дакажы цікавей» і інш.).

Заняткі па азнаямленні дзяцей старэйшага ўзросту з фальклорнымі творамі не могуць быць працяглымі (звычайна 15–20 хвілін), таму важна звяртацца да іх па-за заняткамі, у розных відах дзейнасці. Гэтаму могуць садзейнічаць наступныя метады:

1. *Гутарка* пасля знаёмства з творам. З дзецьмі вядуць размову пра жанр твора, змест, сродкі мастацкай выразнасці.

2. *Прагляд мультфільмаў* па фальклорнаму твору, што эфектыўна толькі пасля знаёмства з самім творам.

3. *Праслухоўванне аўдыёзапісаў.*

4. *Падбор параўнанняў, эпітэтаў, антонімаў, сінонімаў, рыфмы да слоў і словазлучэнняў* з фальклорнага твора малой формы.

5. *Чытанне з музыкальным суправаджэннем.*

6. *Перастварэнне* фальклорнага твора малой формы (прыказкі, загадкі, фразеалагізма, песні) ў апавяданне ці казку.

7. *Харавое агучванне* фальклорных твораў.

8. *Спяванне* фальклорных твораў малой формы.

9. *Мадэляванне* сюжэтнага верша.

10. *Элементарны эмацыйна-вобразны аналіз* тэкста.

11. *Прыдумванне* ўласнага твора па ўзоры фальклорнага.

12. *Чытанне* твораў розных жанраў, аб'яднаных адной тэмай, або твораў з супрацьлеглым зместам.

Фальклорныя творы, якія адабраны з улікам узроставых асаблівасцей дзяцей, даступны для іх успрымання і разумення, з'яўляюцца эфектыўным сродкам фарміравання мастацкага густу дашкольнікаў, «прышчаплення» ў іх асноў народнай маралі і этыкі, развіцця звязнага маўлення. Пры гэтым педагогу неабходна планаваць працу па развіцці звязнага маўлення дашкольнікаў такім чынам, каб ужо ў малодшым узросце ў дзяцей закладваўся падмурак працы з вершамі і невялікімі па памеры празаічнымі творамі.Толькі адштурхоўваючыся ад ужо засвоенага разумення метафарычнага, падтэкставага зместу, можна ісці ў накірунку развіцця маўлення старэйшых дашкольнікаў з дапамогай прымавак, загадак, фразеалагізмаў, баек – тых фальклорных жанраў, якія не могуць быць паўнавартасна засвоены дзецьмі самастойна як звычайнае перайманне з маўлення дарослых.

Малыя формы беларускага фальклору (вершы, лічылкі, загадкі, прымаўкі, пацешкі, песні, хуткагаворкі) эфектыўны ў інтэграваным выкарыстанні: на занятках, у працэсе музычнай, фізкультурнай, побытавай, самастойнай дзейнасці дзяцей (у гульнях, на прагулцы, падчас адпачынку, перад сном), у спалучэнні з рэкамендацыйна-тлумачальнай працай з бацькамі дзяцей. У такім выпадку гэтыя творы станоўча ўплываюць на розныя аспекты маналагічнага і дыялагічнага маўлення дашкольніка, інтанацыйную выразнасць маўлення, фарміруюць уменні пераказу і творчага апавядання (сачынення), інсцэніравання. Спалучэнне розных метадаў стымулюе дзяцей да назірання за мовай твораў, за іх вобразным, эмацыйным ладам, а ў цэлым спрыяе паўнавартаснаму ўспрыманню і разуменню фальклорнага тэкста.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Аполлонова, Н.А. Приобщение дошкольников к русской национальной культуре / Н.А. Аполлонова // Дошкольное воспитание. –1992. –№ 5, 6.
2. Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб. дапам. / А.М. Макарэвіч, В.М. Смаль [і інш.]; пад агул. рэд. А. Макарэвіча, М. Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 688 с.
3. Загрутдинова, М. Использование малых фольклорных форм/ М. Загрутдинова, Н. Гавриш // Дошкольное воспитание. –1991. –№9. –С. 16–22.
4. Концепция образования и воспитания в Беларуси / под ред. В.П. Пархоменко. – Мінск:Адукацыя і выхаванне. – 1994. – 48 с.
5. Развитие речи детей дошкольного возраста /под ред. Ф.А. Сохина. –М.: Просвещение, 1984. –223с.
6. Романенко, Л. Устное народное творчество в развитии речевой активности детей / Л. Романенко // Дошкольное воспитание. –1990. –№ 7. –С. 15–18.
7. Русское народное творчество и обрядовые праздники в детском саду /под ред. А.В. Орловой. –Владимир: Академия, 1995. –185с.
8. Старжынская, Н.С. Методыка развіцця роднай мовы: вучэб. дапаможнік / Н.С. Старжынская, Д.М. Дубініна. – Мінск : Выш. шк. – 2008. – 301 с.
9. Шинкарь, Г. Использование фольклора в работе с детьми младшего возраста / Г. Шинкарь, И. Новикова // Дошкольное воспитание. –1990. –№10. –С. 8–15.


***SmalV.M.*** **Form of the Belarusian Folklore as Factor Language Development and Education of Preschool Children**

The article considers the value of folklore in the development of effective speech of children, methods and techniques of teaching, common problems their solutions preschool teachers.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 14.02.2014